Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

САВЕЦКІ ШЛЯХ

ОРГАН ПАСТАЎСКАГА РАЙКОМА КП БЕЛАРУСІ І РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

выдання 16-ы
№ 8 (2178)

Нядзеля, 19 студзеня 1958 года

Цана 15 кап.

цвярджэнне складу выбарчай камісіі еларускай ССР па выбарах у Савет Нацыянальнасцей

падставе артыкулаў 39, 40 Палажэння аб выбарах у ны Савет СССР» Прэзі- Вярхоўнага Савета БССР дзіў выбарчую камісію скай ССР па выбарах у Са- цыянальнасцей у складзе ных прадстаўнікоў грамад- рганізацый і таварыстваў ных:

шыня выбарчай камісіі А Васілій Філімонавіч — скай абласной камуністыч- ганізацыі.

снік старшыні выбарчай БРОЎКА Пётр Усцінавіч Саюза савецкіх пісьменні- ларускай ССР.

тар выбарчай камісіі У Іван Кузьміч—ад пра- льнага саюза работнікаў ы Беларускай ССР.

мі выбарчай камісіі за- ны: **Жыгалка** Тацяна Іосі- **Крыулін** Глеб Аляксандра- прэвіч Васілій Феафіла- нько Варвара Фамінічна, аў Павел Сцяпанавіч, **Но-** Тацяна Іванаўна, **Алізарэ-** а Грыгораўна, **Палавінка** Паўлавіч, **Рудак** Аркадзій віч, **Сеўчанка** Антон Нікі- **Сямёнаў** Анатолій Пар- **Сяргееў** Ілья Васільевіч, Тацяна Міхайлаўна, Марыя Мікалаеўна, **Труб-** анна Дзям'янаўна, **Яра-** натолій Паўлавіч.

ратура да выбараў

каўнае выдавецтва БССР па да выбараў у Вярхоў- ет СССР на беларускай савымі тыражамі брашу- нстытуцыя Саюза Савец- ыялістычных Рэспублік» кэнне аб выбарах у Вяр- Савет СССР».

ОРАТКА

запрашэнню першага са- ЦК Польскай аб'яднанай партыі тав. У. Гамулкі і Савета Міністраў тав. анкевіча Першы сакратар

Вылучэнне кандыдатаў у склад Пастаўскай акруговай выбарчай камісіі

У раёне прайшло вылучэнне кандыдатаў у склад акруговых выбарчых камісій па выбарах у Вярхоўны Савет СССР. Сваімі пасланцамі працоўныя выбралі лепшых людзей калгаснай вёскі, перадавікоў прамысловых прадпрыемстваў, таварышаў, якім яны поўнасцю давяраюць адказную справу.

На сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у склад Пастаўскай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Савет Саюза № 599, сабраліся члены сельгасарцелі імя Чапаева. Першым слова папрасіў аграном калгаса камуніст Фёдар Кацкель.

— Я прапаную, — гаворыць ён, — у склад акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Савет Саюза вылучыць нашага рахункавода **Койру Люцыю Антонаўну.**

Вынесеную прапанову горача падтрымалі ўсе калгаснікі.

Ад прафсаюзных арганізацый раёна ў склад Пастаўскай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Савет Саюза выбрана заслужаная настаўніца рэспублікі **Разумоўская Яўгенія Мікалаеўна.**

У склад гэтай жа камісіі вылучан настаўнік сярэдняй школы № 1 **Катовіч Іван Яўгеньевіч.**

17 снежня, у перапынку працоўнага дня адбыўся сход рабочых ільнозавода. Наме нік механіка завода Мікалай Цяляк пр панаваў вылучыць у склад камісіі Паста скай выбарчай акругі № 74 па выбарах Савет Нацыянальнасцей здымшчыцу до гага валакна **Жук Ядвігу Пятроўну.** Гэт — перадавая рабочая прадпрыемства, а тыўны ўдзельнік грамадскага жыцц Прапанову т. Целяка аднадушна падтры малі слесар завода Рафаіл Яцкеві брыгадзір мяльна-трапальнага апрэгат Анна Казенка і майстар змены Нін Жмуркевіч. Выступіўшых таварышаў па трымаў увесь калектыў.

Хлебаробы сельгасарцелі «Запавет Ільіча» ў склад акруговай выбарчай ка місіі па выбарах у Савет Нацыянальнас цей вылучылі аграном калгаса **Сойк Ніну Захараўну.**

Члены раённай арганізацыі добраах вотнага таварыства садзеяння арміі, аві яцыі і флоту ў склад гэтай жа камісі вылучылі **Малыгіна Івана Данілавіча.**

Сходы па вылучэнню кандыдатаў склад акруговых выбарчых камісій па вы барах у Вярхоўны Савет СССР прайшл пры высокай палітычнай актыўнасці пра цоўных.

Новы атрад механізатараў

Закончыліся дзяржаўныя экзамены ў Пастаўскім рамесным вучылішчы механізацыі сельскай гаспадаркі. Усе навучаючыяся старанна рыхтаваліся да гэтай незвычайнай падзеі. І гэта не выпадкова. Трэба было кожнаму з іх паказаць перад кваліфікацыйнай камісіяй, на што здольны яны пасля вучобы ў сценах вучылішча.

237 навучаючыхся, паспяхова здаўшы папярэднія выніковыя экзамены, атрымалі права трымаць дзяржаўныя экзамены. Напружаная вучоба на працягу года дала нядрэнныя вынікі. З 237 навучаючыхся здалі экзамены ўраду за вялікія клопаты аб савецкай моладзі. Толькі ў краіне Саветаў такі просты юнак, як я, змог атрымаць бясплатна ганаровую спецыяльнасць трактарыста-машыніста шырокага профілю і слесара III разрада.

Цяпер я пастараюся сумленнай працай апраўдаць аказанае мне давер'е і з ахвотай разам з іншымі еду працаваць на цалінныя землі.

22 студзеня з рамеснага вучылішча на цалінныя землі едзе група механізатараў у складзе 30 чалавек, сярод іх камсамольцы Міхаіл Аляксандровіч, Мечысла Кушэль, Віталь Брэскі, Та дэуш Койра, Іван Свілел Алег Хаткевіч, Антон Гауль іншыя.

Усе астатнія выпускні едуць працаваць у МТС воб ласці, у родныя калгасы, ка на шырокіх калгасных па лях множыць гонар свайг вучылішча.

Дарагія сябры! Шчасліва вам дарогі, добрага здароўя выдатных поспехаў на нова працы!

М. НАУМЕНКА,
сакратар партарганізацыі рамеснага вучылішча.

* * *

Дэманстрацыя дыяфільмаў у школе

Гэта было ў пачатку навучальнага года. Дзесяткі цікаўных дзіцячых вачэй не пераставалі сачыць, як выкладчык фізікі і матэматыкі К. Ф. Пушкар наладжваў на стале ўніверсальны праекцыйны фанар. У класе хутка пагасла святло і на белым экране паявіўся надпіс «Рэльеф СССР».

Цяпер дэманстрацыя дыяфільмаў у Янкішскай сямігадовай школе стала звычайнай з'явай. Прагляд дыяфільмаў дае магчымасць вучням глыбей і паўней засвоіць вучэбны матэрыял. Школьнікі прагледзелі такія дыяфільмы, як «М. В. Гогаль», М. В. Ламаносаў», «Разрэз рухавіка ўнутранага згарання», «Помпа паветраная ручная» і іншыя.

В. МАЖЭЙКА,
дырэктар школы.

БЛЮМА — МАНІКЮРША

На кухню з сумкай і сеткай у руках працінулася жанчына, і адразу гэтае памяшканне напоўнілася незвычайным для яго пахам духоў, пудры і іншых рэчаў парфюмерыі.

— Я да вас, Блюма Грыгораўна, — звярнулася ўвайшоўшая і, зняўшы прыгожыя замшавыя пальчаткі, выразна паглядзела на свае выпешчаныя рукі.

— Сядайце, калі ласка, —замітусілася гаспадыня і, падставіўшы госці табурэтку, зноў стала завіхацца каля другой кліенткі, якая ў гэты час трымала свае пальцы ў мыльнай вадзе.

— Вось і гатова, рукі вашы проста цудоўныя,— залюбавалася сваёй работай манікюрша. — Думаю, што і ў другі раз заглянеце сюды. Блюма Гардон — майстар сваёй справы...

Расказ Блюмы Грыгораўны аб вартасцях манікюра і аб сваіх майстэрскіх здольнасцях перапыніў моцны стук у дзверы. На парозе паявілася новая кліентка, і манікюрша з прыветлівай усмешкай паспяшалася ёй насустрач.

Многа ў гэты дзень было работы ў манікюршы. Адна за другой прыходзілі сюды маладыя і ў гадах кліенткі. І ўсіх яна ветліва сустракала, а праводзячы з пакоя, запрашала наведваць і ў другі раз.

У іншыя дні, людзі кажуць, кліентаў бывае і больш. Настала чарга наведаць «майстэрню» Блюмы Гардон падатковаму інспектару. Вось яе і адрас: Ленінская, 6.

К. ПУХІН.

Дапамог нос

Я, браткі, звярок, хоць не шпаркі на нагу, але вельмі рухавы. Дзе я толькі не пабываю за дзень, чаго толькі не ўбачу. Іншы раз хочацца і ў пасцелі пазней паляжаць, але спакою не дае мне нос, які здалёк чуе розныя непаладкі. У апошні раз ён улавіў пах самагонкі. Накіраваўшыся ў гэтым напрамку, я хутка апынуўся на Кастрычніцкай вуліцы. Сумнення не было: пах даносіўся з дома № 93. Не раздумваючы, я юркнуў у падваротню і праз хвіліну адшукаў 4 літры самагонкі. Нос мой улавіў якійсці вельмі прыемны пах.

«Што б гэта магло быць?»—думаў я, паціхоньку перакладваючы клункі. І хутка віноўнік прыемнага паху быў знойдзен. Перад мной ляжала цэлая хустка лаўровага лісту, а за ім некалькі бруской дрожжаў.

«Тут жыве спекулянт»,— рашыў я і ўжо хацеў адправіцца да хаты, як раптам у пакой увайшлі два мужчыны, а за імі гаспадыня, ужо пажылая жанчына. З іх размовы я даведаўся, што завуць яе Гэнаэфай Каетанаўнай Цярлюк.

Расказваць аб тым, як прыйшоўшыя пілі знойдзеную мной самагонку, а потым учынілі бойку, я не буду. У гэты дзень на спекулянтаў мне надта вязло. На рынку я ўбачыў самагоншчыц Клаўдзію Сцяпанаўну Гарбаценка, Адэлю Андрэеўну Тышэўскую і другіх. Праўда, тут яны не прадавалі самагонку, а штосьці ўладкоўвалі з работнікамі рынка Варашкевічам і Дубоўскім.

ВОЖЫК.

Рэдактар І. А. МАНДРЫК

НУ рэспублікі

пытаннях. На факультэтах і курсах часта праводзяцца канферэнцыі чытачоў, вечары адпачынку, у актавай зале дэманструюцца кінафільмы, выступаюць са спектаклямі артысты драматычнага тэатра. У гуртках мастацкай самадзейнасці прымае ўдзел больш 400 студэнтаў. Толькі ў хоры ўдзельнічае каля 200 студэнтаў. 14 разоў на працягу года выступаў драматычны гурток у сваёй актавай зале і на сцэнах іншых клубаў горада з п'есамі «Сварка» Мечына, «Кола шчасця» братоў Тур, «Вечна жывыя» Розава.

Вялікае значэнне ў інстытуце надаецца спартыўнаму выхаванню студэнтаў. Тут культывуецца 13 відаў спорту, заняткамі ў секцыях ахоплена больш 350 студэнтаў. Спартсмены ВНУ выязджалі ў Гомель, Віцебск, Мінск і іншыя гарады, дзе сустракаліся з мясцовымі камандамі па розных відах спорту.

Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут з кожным годам расшырае сваю навучальна-вытворчую базу. У бліжэйшы час тут закончыцца будаўніцтва новага змешанага навучальнага корпуса і інтэрната. Інстытут атрымае дадатковa 12 лекцыйных